# НОВЫ 2017/2018 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

29 жніўня 2017 года ў г.Пружаны адбылася пленарная абласная жнівеньская нарада педагагічных работнікаў «Адукацыя Брэстчыны: вопыт, рэсурсы, задачы прафесійнай рэалізацыі асобы». Для ўдзелу ў нарадзе прыбылі дэлегацыі педагагічных работнікаў усіх раёнаў вобласці і горада Брэста.




У рамках правядзення абласной нарады працавала выстава творчых дасягненняў навучэнцаў устаноў адукацыі вобласці. Была прадстаўлена выстава тэхнічнай творчасці: робататэхніка, беспілотныя лятальныя апараты, экспанаты, якія прымалі ўдзел у




конкурсах Саюзнай дзяржавы «Таленты XXI стагоддзя», найпростыя мадэлі, выраблены малодшымі вучнямі аб'яднанняў па інтарэсах. Турысцка-краязнаўчы профіль Пружанскага ЦТДМ прэзентаваў новы напрамак - спартовае скалалажанне.

Выставу наведалі ўдзельнікі нарады, педагогі горада Пружаны, а таксама губернатар Брэсцкай вобласці А.В. Ліс і начальнік упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама Ю.М. Прасмыцкі.

Наведалі выставу і выкладчыкі Пружанскага каледжа, якія знайшлі для сябе цікавыя ідэі і натхненне для паспяховай арганізацыі педагагічнай дзейнасці.

Па выніках нарады былі калегіяльна выпрацаваны рэкамендацыі па развіцці адукацыі ў Брэсцкай вобласці.

